Са сказанага вышэй вынікае, што гавэнда “Хадыка” У. Сыракомлі мае ўсе асноўныя рысы сюжэтнай схемы рабінзанады: ізаляцыю героя ад знешняга свету, мемуарны характар аповеду, насычанасць дэталёвымі апісаннямі спосабаў выжывання, дакументальнасць асновы. Менавіта таму мы можам лічыць твор першым узорам жанру ў беларускай літаратуры.

**Літаратура**

1 Цвірка, К. А. Слова пра Сыракомлю / К.А. Цвірка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – С. 186.

***М. А. Бірыла***
*Навук. кір.* ***Л. В. Паплаўная,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## СІСТЭМНЫЯ АДНОСІНЫ ФРАЗЕАЛАГІЧНЫХ АДЗІНАК СА ЗНАЧЭННЕМ АСОБАСНАЙ ХАРАКТАРЫСТЫКІ

Аб’ектам нашага даследавання з’яўляюцца фразеалагічныя адзінкі з семантыкай асобаснай характарыстыкі, выбраныя са “Слоўніка фразеалагізмаў беларускай мовы” ў 2 тамах І. Я. Лепешава. Такія фразеалагізмы характарызуюць інтэлектуальныя здольнасці чалавека, вызначаюць рысы яго характару. Вылучаныя фразеалагічныя адзінкі могуць уступаць у сінанімічныя і антанімічныя адносіны.

Фразеалагічныя сінонімы – гэта фраземы, якія абазначаюць тое самае ці блізкае паняцце, але адрозніваюцца адценнямі значэнняў ці эмацыянальна-экспрэсіўнай (стылістычнай) афарбоўкай.

Так, у адзін сінанімічны рад могуць аб’ядноўвацца наступныя фразеалагізмы з асобаснымі характарыстыкамі чалавека:

1) **ціхі, лагодны:** *божая кароўка, вады не замуціць, мухі не пакрыўдзіць, цішэй вады ніжэй травы*;

2) **разумны, кемлівы**: *на галаву вышэй, галава варыць, не галава, а дом саветаў, светлая галава, <ёсць> < свая> галава на плячах;*

3) **дурны**: *ні бум-бум, галава <і> два вухі, галава яловая, дубовая галава, без галавы , пустая галава, клёпкі не хапае <у галаве>, конік Божы (Ісусаў), куст альховы, мякіна ў галаве, дурны поп хрысціў, без цара ў галаве;*

4) **легкадумны**: *з ветрам (з ветрыкам, з вецярком) у галаве, як у полі вецер, гарачая галава.*

Фразеалагічная антанімія, як і фразеалагічная сінанімія, адлюстроўвае сістэмныя сувязі гэтых адзінак. Аднак у адрозненне ад сінанімічных фразеалагізмаў фразеалагізмы-антонімы маюць супрацьлеглыя значэнні, але характарызуюць прадметы (дзеянні, прыметы) абавязкова толькі ў адным плане. Сярод фразеалагічных адзінак з асобаснай характарыстыкай былі вылучаны наступныя антанімічныя пары:

1) **разумны – дурны:** *з галавой – без клёпкі ў галаве; светлая галава – алёша з батонамі;*
2) **умелы – няўмелы**: *залатыя рукі – ні млён ні таўкач*; *і шавец (швец) і жнец і на дудзе (на дудцы, у дуду) ігрэц -- не адтуль рукі растуць;*
3) **вопытны – нявопытны:** *біты воўк -- молада-зелена; стрэляны верабей – жаўтаротае птушаня;*
4) **здольны -- бяздарны:** *бог не пакрыўдзіў (не абдзяліў) – бог пакрыўдзіў.*

Антанімія сярод фразеалагічных адзінак з семантыкай асобаснай характарыстыкі менш пашыраная з’ява, чым сінанімія.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ